Посольство Республики Беларусь в Литовской Республике

29.11.2018

# Аб мерапрыемствах, прысвечаных факсімільнаму выданню «Буквара», з удзелам Пасла Беларусі ў Літве А.Караля

29 лістапада 2018 года Пасольства Беларусі ў Літве зладзіла шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных факсімільнаму выданню першага ў свеце «Буквара» на царкоўна-славянскай мове.

Роўна 400 гадоў таму ў Еўі, зараз Вевіс (Літва), «Буквар» быў падрыхтаваны і выдадзены нашымі продкамі — манахамі праваслаўнага Віленскага манастыра Святога Духа.

З гэтай нагоды сёняшняй раніцай «Буквар» быў асвечаны ў Царкве Успення Прасвятой Багародзіцы (Вевіс), такім чынам сімвалічна вярнуўшыся на землі, дзе ў 1618 годзе ён упершыню пабачыў свет.

У Літоўскай нацыянальнай бібліятэцы імя Марцінаса Мажвідаса таксама адбылася прэзентацыя, якую ўрачыста адкрылі Пасол Беларусі ў Літве Аляксандр Кароль, Генеральны дырэктар бібліятэкі ім.Мажвідаса Рэйнальдас Гудраўскас і намеснік дырэктара Нацыянальная бібліятэкі Беларусі Алесь Суша.

Падчас прэзентацыі выданні «Буквара» былі ўрачыста перададзеныя ў калекцыі найбунейшых літоўскіх бібліятэк — Нацыянальнай, Акадэмічнай і Універсітэцкай, а таксама Віленскай беларускай гімназіі імя Францыска Скарыны, Свята-Духаву манастыру і Гістарычнаму музею Тракайскага замка.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел кіраўнікі замежных дыпламатычных місій, акрэдытаваных ў Літве, дырэктары музеяў і бібліятэк Літвы, прадстаўнікі культурных і дыпламатычных колаў абедзьвух краін і шматлікія іншыя шаноўныя госці.


















YAMAGATA